**ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ**
**па правядзенні выбараў**
**у Каардынацыйную Раду III склікання**

# РАШЭННЕ

аб выключэнні кандыдатаў са спісу выбарчага суб’екта
і ўнясенні зменаў у Пастанову аб зацвярджэнні спісаў выбарчых суб’ектаў

2 траўня 2024 года г. Варшава

Выбарчая камісія па правядзенні выбараў у Каардынацыйную раду III склікання (далей - Выбарчая камісія) ў асобах Алены Прыходзька (старшыні), Андрэя Атаманчука, Яраслава Бекіша, Дзмітрыя Лазавіка, Альвіны Мінгазавай і Алены Філатавай, разглядзеўшы ліст ад выбрачага суб’екта “Независимые белорусы”,

## ВЫЗНАЧЫЛА:

1 траўня 2024 года ў Выбарчую камісію паступіў ліст ад кандыдата выбарчага суб’екта “Независимые белорусы” Сяргея Бяспалава, да якога далучана заява на адрас Выбарчай камісіі ад ініцыятара выбарчага спіса Максіма Шабуцкага. У заяве ўтрымліваецца просьба выключыць са спісу выбарчага суб’екта наступных кандыдатаў: Уладзімір Салавей (пад нумарам 2), Мікалай Бойка (пад нумарам 12) і Андрэй Гаўрылюк (пад нумарам 14).

Выбарчая камісія звяртае ўвагу на адсутнасць асобы Уладзіміра Салаўя у вышэй указаным спісе кандыдатаў, але ў складзе выбарчага суб’екта прысутнічае **Уладзіслаў** Салавей пад нумарам 2. Камісія прыходзіць да высновы, што мела месца апячатка, якая не патрабуе ўдакладненняў ад выбарчага суб’екта, з улікам чаго пад Уладзімірам Салаўём разумеецца Уладзіслаў Салавей.

У адпаведнасці з падпунктам 7.1 пункта 7 Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную раду ад 31 сакавіка 2024 года, “калі пасля завяршэння рэгістрацыі з спіса выбарчага суб’екта выбывае кандыдат, выбарчы суб’ект павінен паведаміць аб гэтым у Камісію з цягам 1 дня”. Выбарчая камісія прыходзіць да высновы, што кандыдаты Уладзіслаў Салавей (пад нумарам 2), Мікалай Бойка (пад нумарам 12) і Андрэй Гаўрылюк (пад нумарам 14) выбылі са спіса выбарчага суб’екта “Независимые белорусы”, у сувязі з чым дадзеныя кандыдаты мусяць быць выключаны са спісу.

На падставе вышэй выкладзенага, Выбарчай камісіяй

**ВЫРАШАНА:**

Кандыдатаў спіса выбарчага суб’екта “Независимые белорусы” Уладзіслава Салаўя (пад нумарам 2), Мікалая Бойку (пад нумарам 12) і Андрэя Гаўрылюка (пад нумарам 14) - са спісу выключыць.

Унесці адпаведныя змяненні ў Пастанову аб зацвяржэнні спісаў выбарчых суб’ектаў ад 25 красавіка 2024 года; спіс кандыдатаў прывесці ў адпаведнасць з патрабаваннямі Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную раду ад 31 сакавіка 2024 года.

Старшыня Выбарчай камісіі А. Прыходзька